Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 ЛЮТАГА 2018 г. СЕРАДА № 26 (28642)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**Назначаны новыя кіраўнікі цэнтральных СМІ**

СТАР. 2



**Абяцаная інфляцыя не перавысіць 6 %**

СТАР. 4



**Конкурс «Хто каго» як трэнінг для мазгоў**

СТАР. 12

■ Прэм'ера рубрыкі: фота на трынаццатую

# Бабулін заплыў



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Гэтым фотаздымкам, выкананым маладым фотакарэспандэнтам Ганнай Занкавіч, «Звязда» прэзентуе новую рубрыку «Фота на трынаццатую», пад якой на, вядома ж, 13-й старонцы газеты кожную сераду будуць друкавацца матэрыялы нашых фотакараў — рэпартажы, тэматычныя падборкі, фотафакты з падзей і проста эмацыянальныя моманты з жыцця. Звяздоўскія фоталетапісцы, а іх у штаце рэдакцыі пяцёра, не толькі паспяваюць сачыць за шматлікімі падзеямі, выязджаюць у рэгіёны краіны, ілюструюць матэрыялы сваіх калег, але ўносяць свой уклад і ў творчы працэс стварэння газетнай прасторы, выступаюць з асабістымі тэмамі і фотапраектамі. У скарбонках нашых маладых і сталых майстроў назапашваецца нямала змястоўных здымкаў. Тым больш што ў сучасным жыцці фатаграфія заваёўвае ўсё большую папулярнасць: гаворачы слэнгавай мовай, фотаздымак сёння ў трэндзе. Спадзяёмся, адкрываючы новую фота-старонку, «Звязда» і надалей пойдзе ў нагу з сучаснымі тэндэнцыямі.

Не сакрэт, здымкі, удала схопленыя альбо падгледжаныя ў віры жыцця, не патрабуюць расшыфроўкі і тлумачэнняў. Сама па сабе фатаграфія з'яўляецца і словам, і фактам, і жэстам. Вось і гераіня першапалоснага фотаздымка сваім жыццесцвярджальным жэстам жадае новай рубрыцы цікавага і плённага шляху да чытача.

Такім чынам, гартайце, знаходзьце і глядзіце нашу 13-ю старонку!

**Анатоль КЛЯШЧУК, загадчык аддзела фотаілюстрацыі.**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Алег ТОКУН, начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:**

*«Колькі чалавек можа трапіць пад дзеянне Дэкрэта № 1? Калі зыходзіць з балансу працоўных рэсурсаў Беларусі (пакуль у нас ёсць выніковыя звесткі толькі за 2016 год, за 2017-ы будуць крыху пазней), то гэта можа быць прыкладна 250 тысяч чалавек. Мы пра іх чамусьці не ведаем. Гэта значыць, афіцыйная статыстыка не ведае, чым яны займаюцца. Так, магчыма, гэта мігранты, якія з'ехалі. Безумоўна, там будзе і частка людзей, якія знаходзяцца ў цені. Тыя, хто працуе нелегальна або без афармлення працоўных адносін, або сам на сябе, не рэгіструючыся ні рамеснікам, ні індывідуальным прадпрымальнікам. Такія людзі будуць. Пад дзеянне дэкрэта трапяць тыя, хто знаходзіцца ў працаздольным узросце, у самым росквіце сіл і гадоў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.02.2018 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9894 | ▲ |
| Еўра | 2,4666 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0348 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0722 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

18026

■ Размова па сутнасці

# САКРЭТЫ КНІЖНАГА СВЕТУ

## Як выдаўцам, гандлярам і аўтарам знайсці агульную мову?

**Зусім хутка ў культурна-асветніцкім жыцці нашай краіны адбудзецца важная падзея — XXV Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш. Месцам сустрэчы выдаўцоў, кнігагандляроў, аўтараў, літаратурных крытыкаў і, вядома ж, чытачоў стане выставачны цэнтр «БелЭкспа», што па адрасе праспект Пераможцаў, 14. Там будуць адбывацца і гучныя кніжныя прэзентацыі, і гарачыя літаратурныя дыскусіі, і актуальныя публічныя чытанні. Чым сёння жыве айчынная кніжная сфера, з якімі праблемамі сутыкаецца і якія мае дасягненні, напярэдадні выстаўкі, абмеркавалі за круглым сталом у Выдавецкім доме «Звязда». «Беларуская кніга ў сучасным грамадстве» — так была акрэслена тэма. І яна аказалася надзвычай актуальнай — выдаўцам нават не было часу расказаць пра свае навінкі, бо хацелася абмеркаваць самыя важныя пытанні.**

СТАР. 8-9



Фота БЕЛТА.